НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ

Цана асобнага нумару 800 м. п.

Адрэс рэдакцыі і адміністрацыі: Вільня, Вострабрамская вул. 9 (Ostrobramska 9).

Рэдакцыя адчынена ад 12 да 2 штодня апрача сьвяточных дзён.

Выходзіць раз у тыдзень.

Падпіска на адзін месяц з дастаўкай да хаты 3000 м.п. Для заграніцы ўдвая даражэй.

Няпрынятыя ў друк рукапісы назад ня вертаюцца. Аплата надрукованага залежыць ад рэдакцыі.

Цана абвестак: перад тэкстам 400 мк., сярод тэксту 600 мк. і на апошняй страніцы 200 мк. за радок пэтыту ў 1 шпальт.

№ 7. Нядзеля, 22-га красавіка 1923 г. Год І.

УВАГА! Рэдакцыя і адміністрацыя газэты „НОВАЕ ЖЫЦЬЦЕ“ з 20-га сакавіка (марца) зьмяшчаецца на ВОСТРАБРАМСКАЙ вул. № 9.

У справе заарыштаваных.

Як стала вядома ў апошнія дні, амаль ня ўсе арыштаваныя ў другой палове сакавіка г. г. у Дзісьненскім, Ваўкавыскім і Сьвянцянскім паветах, прыймалі чыннае учасьце ў беларускай агітацыі ў часе выбараў. Па тых пагрозах, якія кідаліся ў час выбараў і па дапросах з арыштаваных можна сьмела сказаць, адбыўшыяся арышты ёсьць адплата з боку паліцыі за выбарную працу. Есьць і фактычныя падставы на гэта. Пры арыштах (ў Язьненскай гміне Дзісьненскага павету Балай з в. Заборья і Тарарака з в. Парадня — былі біты зялезнымі прутамі), паліцэйскія пры рэвізіі задавалі гэткія пытаньні: „A jaki ty № rzucił“? „A za jaki ty № agitował?“ Заарыштаваныя па распараджэньню Апеляцыйнага Суда ў Вільні беларусы з вёсак Ваўкавыскага павету (Вінцэнт Кардаш з вёскі Навасады, Язэп Ляшчынскі з в Дзевятнаўцы і Сьцяпан Ляшчук з в. Шымкі—усе сябры гміннае Рады), былі дапрашаваны аб іх учасьці ў выбарах. Перад звальненьнем з астрогу 20. III 1923 г. з іх, як і з усіх звольненых, узята падпіска, што яны ў далейшым ня будуць вясьці жаднай беларускай агітацыі. Відаць, што значная частка арыштаў была для таго толькі і зроблена, каб запужаўшы людзей і тэрорызаваўшы кожнага з іх, зьвязаць яго пад суровымі пагрозамі вымушанай падпіскай, што ён далей не павінен сябе выяўляць за беларуса і ніякай акцыі ў гэтым напрамку вясьці ня будзе. Прынамсі так усё выглядае, бо 0,9 з арыштаваных ужо выпушчана на волю.

Калі больш-менш уплывовы і сьвядомы сваей нацыянальнасьці беларус—вясковец перанёс увесь страх арышту ў начы, пры звычайнай сыстэме з падняцьцем ўгару рук, пры самай строгай рэвізіі яго самога і ўсяе яго сямьі ўсіх хатніх рэчаў, усіх будынкаў, вывезены ўначы-ж у невядомым кірунку, няведаючы за што арыштованы, калі яго як разбойніка нейкага вядуць па вуліцах Вільні скованага папарна ў ручных кайданах, калі памучаць яго ў працягу 2-х тдняў дапросамі аб учынках, якія яму ніколі і ня сьніліся, калі пры гэтым дадуць яму на памятку столькі гасьцінцаў (і рукамі паліцэйскіх, і зял. палкамі да непрытомнасьці з адліваньнем-вадой, ды калі гэта паўтараецца яшчэ некалькі разоў), што ён і праз доўгі час гэтага не забудзецца, дык ясна, што усё гэта дзеецца толькі дзеля таго, каб энэргічныя і найбольш сьвядомыя беларусы сядзелі дома ціхусенька — не выпісывалі-б беларускіх газэт, ня чыталі іх суседзям і не гаварылі нікому аб вестках з іх, не чыталі беларускіх кніг, не дбалі аб сваей школе і г. д.

Можна думаць, што гэтая сыстэма можа даць пэўныя скуткі на глухай вёсцы. Бачыць перамучаны арыштам чалавек, што найменшае выяўленьне ім беларускасьці пацягне за сабой новы арышт з усімі яго рэзультатамі—і сапраўды цішэй і асьцярожней пачынае сядзець.

Гэткімі мерамі намагаецца ўлада затамаваць беларускі рух — запужаць беларускі рух — запужаць, стэрорызаваць беларускую масу, каб паказаць сьвету, што тут абсалютна усё спакойна, а, значыцца, ўсе жыхары здаволены сваім лёсам, здаволены ўладай і сучаснымі парадкамі, а роўна і адносінамі яе да беларускае нацыянальнасьці.

Відаць, забываюцца кіраўнікі гэткае палітыкі, што тое азлабленьне, тая ненавісьць, якая расьцець ў душы народу з прычыны памянёнай сыстэмы тамаваньня народнага духу, ёсьць дужа небясьпечная праява для існуючага парадку. Рэпрэсыямі (і біцьцём арыштаваных) можна напужаць, стэррорызаваць які дзесятак-другі маладушных людзей, але нельга гэтым прымусіць увесь народ вырачыся сваіх нацыянальных ідэалаў і адпаведных, належных вымаганьняў.

Баутручонак.

Палітычныя падзеі.

Нямеччына. Тры месяцы прайшло, як французы і бэльгійцы акупавалі Рурскі басэйн, а да гэтага часу сытуацыя ня зьмянілася, і акупанты ня атрымалі пажаданых вынікаў. Абсадзіўшы войскамі вялікі прамысловы район, акупанты ня гледзячы на вялізарныя расходы, арышты, разстрэлы і ўсялікія іншыя рэпрэсыі не змаглі падолець арганізаванага спраціву нямецкага народу і не атрымалі ніякіх эканамічных карысьцей, і чым болей цяпер выясьняецца гэтая няўдача францускага імпэрыялізму, тым большыя рэпрэсыі прыменяюць акупанты да рабочых і наагул нямецкай людпасьці.

Італія. Урад Мусоліні пачаў новыя рэпрэсыі проціў работніцкай клясы. У працягу 2 дзён арыштавана каля 7.000 работнікаў. У часе арыштаў стасуюцца нялюдзкія зьдзекі і гвалты. Мусоліні ў парлямэнце заявіў: „Мане мала абходзіць, ці загавор у фармальным сэнсе існуе ці не... Хай ворагі *фашыстоўскай* дзяржавы ня дзівяцца, калі спаткаюцца з майго боку з крайняй жорсткасьцю“. А сэкратар фашыстаўскай Вялікай Рады заявіў „Мусоліні сказаў мне, што ўвядзе кару сьмерці, раз. фашысты гэтага захочуць. Калі рэвалюцыйныя элемэнты далей будуць вясьці сваё дзела, дык хутка паставім шыбеніцу“.

Польшча. У знак пратэсту проціў прыгавару суда ў Сав. Расеі на арцыбіскупа Цепляка і 13 ксяндзоў, у Варшаве адбыліся дэманстрацыі, якія ўрэшце вылілiся ў пагромны рух проціў жыдоў; шмат жыдоў, як гаворыць афіцыялны камунікат, „poturbowano“.

Прамыслоўцы, выкарыстоўваюць эканамічны крызыс для сваіх палітычных мэтаў, агранічваюць працу, зачыняюць фабрыкі, хочучы гэткім чынам змусіць работнікаў да зьніжкі плат. Самі-ж адыгрываюць ролю нявінных і скардзяцца на строгасьць ураду Сікорскага, які, быццам, ня ўдзяляе для іх крэдытаў. Але на дзеле справа стаіць зусім іначай. Згодна з выясьненьнямі Міністэрства фінансаў крэдыты для прамыслоўцаў шмат павялічаны, так у лютым адпушчана 124 мільярды марак польскіх і 125 тысяч злотых пол., а ў працягу першых 10 дзён сакавіка каля 40 мільярдаў м п.; агульны лік крэдытаў удзеленых Р. К. К. Р. безпасрэдна і праз учот вэксалёў банкавых інстытуцый на 31 сакавіка перавысіў суму 300 мільярдаў м. п.

Катастрафічны спадак польскай валюты нікога ня можа задзівіць, калі прыняць пад увагу, што Р. К. К. Р. друкуе штодня 5 мільярдаў пол. мар. Друкаваньне дробных банкнотаў зусім ня аплачываецца, бо надрукаваньне напр. 100 марк. білета каштуе ўжо 830 м. п., 500 марк—920 м. п.; толькі 5.000 білеты аплачываюць сябе, вось дзеля чаго сталі друкавацца 10.000 і 50.000 банкноты.

Варшаўскія газэты поўны весткамі аб самагубствах, прычынай якіх зьяўляецца голад, і адсутнасьць працы; усё часьцей здараюцца выпадкі, калі на вуліцах знаходзяць людзей аслабеўшых ад голаду.

Беларускі працэс у Беластоку.

Заарыштаваным беларусам, якія ўжо другі год сядзяць у беластоцкім вастрозе, даручаны нядаўна акт абвінавачаньня. Абвінавачываюцца гэткія асобы:

1. Вера Маслоўская, 2. Аўгэня Матэйчук, 3. Константы Матэйчук. 4. Андрэй Каляда, 5. Рыгор Каляда, 6. Рыгор Астроўскі, 7. Мацей Грычас, 8. Аляксандар Станкевіч, 10. Захар Леванень, 11. Карней Масальскі, 12. Аляксандар Андрэйсюк, 13. Антон Ядвасюк, 14 Клемусь Жамойдзь, 15. Аляксандр Парук, 16. Казімір Вайткевіч 17. Язэп Сахарчук, 18. Карней Купріянюк, 19. Аляксей Тарасэвіч 20. Пётра Санчук, 21, Антось Лукашук, 22. Кузьма Бартасюк, 23 Кірыла Бартасюк, 24. Язэп Бушка, 25. Макар Васілюк, 26. Амільян Валасевіч, 27. Кузьма Трахімюк, 28. Адам Трыпуза, 29. Сьцяпан Жабінскі, 30. Зьмітра Стасюк, 31. Павал Шыманюк, 32. Язэп Шыманюк, 33. Андрэй Рошчэнка, 34. Аляксей Нічапарук, 35. Анісім Захарац, 36 Уладзімір Вапп, 37 Аляксандра Назарук, 38. Аляксей Стасюк, 39. Сабасьцьян Смык, 40. Сымон Мацеевіч, 41 Яўхім Іванюк, 42. Мікалай Вольф, 43. Тодар Крот.

Усе яны абвінавачываюцца за учасьце ў беларускай арганізацыі, якая мела на мэце утварэньне, за помачай аружнага паўстаньня проці Польшчы, незалежнай Беларускай Народнай Рэспублікі.

Арганізацыя гэта была выкрыта на пачатку 1922 г. Ekspozyturą 5 f policji Państwowej ў Беластоку, дзякуючы таму, што ў склад яе ўвайшоў правакатар неякі Ленкевіч.

Суд над усімі абвінавачанымі мае ў хуткім часе адбыцца ў Беластоку.

Судавы працэс мае прыняць шырокі разьмер; заклікаюцца на абарону выдатныя адвакацкія сілы.

— Праз увесь час адбываюцца нарады паміж Хьенай і Пястам ў справе ўтвареньня польскай парлямэнцкай большасьці, на якую-б апіраўся права-цэнтравы ўрад. Эндэкі, каб дапяць улады нават згаджаюцца на „пястоўскую“ зямельную рэформу, ясна што гэтая рэформа будзе скіравана перадусім на нашы „крэсы“, каб пасадзіць тут новых асаднікаў з заможных польскіх „вітасоўскіх“ мужычкоў. У гэтую польскую большасьць стараюцца ўцягнуць і Нар. Раб. Партыю Калі-б дайшло да паразуменьня паміж гэтымі партыямі, дык, пэўна, кабінэт Сікорскага падаўся-б у адстаўку, а утварыўся-б выразна-рэакцыйны кабінэт, з Вітасам-Корфантым на чале.

Літва. Гальванаўскас і Сілзікаўскас прыехалі да Жэнэвы, каб узяць удзел у паседжаньні Рады Лігі Народаў, на якім мае быць абгаворана справа перадачы Міжнароднаму Трыбуналу літоўскага пратэсту, проціў пастановы Рады Лігі ў справе падзелу нэйтральнай паласы.

Літоўскі ўрад выслаў ноту да Рады Лігі Народаў, у якой дамагаецца перадачы справы Віленшчыны Міжнароднаму Трыбуналу, заяўляючы, што Літва астатняе за сабою права распачаць вайну з Польшчай.

Індыя. У № 5 нашай газэты мы ўжо пісалі аб рэвалюцыйным руху ў Індыі, і што ангельскія ўлады прыгаварылі 172 індускіх сялян на шыбеніцу. Зьверства гэтага „легальнага забойства“ ня мае сабе роўнага ў крывавых падзеях ангельскага панаваньня ў Індыі, тым болей што гэта толькі аддзельныя эпізоды дзікага тэрору, пры помачы якога ангельскія заборцы (хаця гэта можна сказаць і пра ўсякую іншую заборчую ўладу) хочуць утрымацца ў Індыі.

Запраўды ад 1919 г. Індыя зьяўляецца арэнай масавых забойстваў і самых жорсткіх рэпрэсый. Брытанскія імпэрыялісты паслугоўваюцца танкамі, бамбардыраваньнем вёсак з самалётаў, кулямётамі і штыкамі, каб у крыві затапіць незалежніцкі рух. У ангельскіх турмах сядзіць болей як 30.000 мужчын і кабет, арыштаваных і прыговоренных на доўгія гады за ўдзел у нацыянальным руху. 6.689 сялян з Малабару прыгаварана на катаржныя работы, 5 з іх павешана, 70 затручана ўдушлівымі газамі; 5 600 сялян з Пенджабу пасаджаны ў вастрогі.

Большасьць засуджаных—гэта бедныя сяляне, даведзеныя да атчаю праз усё ўзрастаючы цяжар ваенных падаткаў і дарагоўлю. Рух гэты скіраваны аднačасна проціў індускай абшарніцкай арыстакраціі і чужацкаму ўраду, якія ў хаўрусе эксплёатуюць індускіх сялян. Трэба адзначыць, што рух гэты мае мірны характар і ўнікае гвалтаў. Але заборныя ўлады ня хочуць талераваць нават мірных дэманстрацый безбаронных мас, як гэта было ў Шауры-шора, дзе паліцыя страляла залпамі ў 3-х тысячны паход і дзе гэтая правакацыя прывела к таму, што дэманстранты спалілі пастарунак і забілі 22 паліцыянтаў.

Гэтыя гвалты адбіліся галосным рэхам па ўсім краі. Антыангельскі рух шырака разьліўся, выклікаючы з боку ўладаў дзікія рэпрэсыі. Невядомы лік ахвяр, згінуўшых ад рук ангельскіх палачоў „ў імя ладу і парадку“ бяз суда. Тысячы арыштавана, 228 адданы пад суд, 172 прыгавораны на шыбеніцу.

Турцыя. У хуткім часе зноў начнуцца ў Лазане перагаворы паміж Турцыяй і Вялікімі дзяржавамі ў справе міру на Блізкім Усходзе.

Югаславія. Як вядома ў Югаславіі нядаўна адбыліся выбары ў Скупшчыну (Сойм). У папярэдняй Скупшчыне большасьць належала да радыкальнай сэрбскай партыі, на якую апіраўся ўрад Пашыча, прыхільнік манархічнага устрою і цэнтралызацыі. Але Югаславія не зьяўляецца з боку нацыянальнага дзяржавай адналітаю: побач з сэрбамі ў склад яе ўходзяць і іншыя славянскія народы: Словенцы і Харваты, якія рожняцца ад сэрбаў мовою, рэлігіяй, культурай і гістарычнымі традыцыямі. Асабліва харваты маюць моцныя імкненьня да самадзельнага праўна-дзяржаўнага істнаваньня і рэспубліканскія настроі, і жадаюць утварэньня сэрбска-харвацка-славенскай рэспублік на падставе фэдэрацыі.

У знак пратэсту проціў цэнтралістычнай палітыкі цяперашняга ўраду, харвацкія дэпутаты ў папярэдняй Скупшчыне байкатавалі парлямэнцкую працу і маючы падтрыманьне сярод іншых дэмакратычных груп. паставілі Урад Пашыча перад альтэрнатывай або падацца ў адстаўку, альбо назначыць новыя выбары. Пашыч выбраў апошняе,

надзеі, што новыя выбары дадуць яму абсалютную большасць, але гэтая надзея завела. Радыкальная сэрбская партыя на агульны лік 312 дэпутатаў атрымала 122 мандаты ў той час як харвацкая сялянская партыя С Радзіча ўзмацавалася і разам з нацыянальнымі і рэлігійнымі меншасьцямі, утварыла проціўурадавы антыцэнтралістычны блёк, які налічывае 118 дэпутатаў. Што датыча дэмакратычнай партыі, трэба адзначыць, што хаця ў старай Скупшчыне яна і падтрымлівала ўрад, аднак за апошнія часы сярод яе праяўляюцца моцныя цячэньні ў бок уступак дамаганьням харвацкіх фэдаралістаў і на падтрыманьня яе ўрад Пашыча лічыць ня можа.

Сытуацыя абастраецца выпадкамі апошніх дзён, якія бязумоўна адыграюць вялікую ролю ў палітычным жыцьці Югаславіі. У пярэдадні Вялікадня ў Загрэбе адбыўся зьезд усіх нававыбраных харвацкіх дэпутатаў, якія пад кіраўніцтвам Радзіча зарганізовалі Харвацкую Нацыянальную Рэпрэзантацыю. Выданая ёю адозва абвяшчае, што Харвацкая Нацыянальная Рэпрэзантацыя зьяўляецца легальным наступнікам Харвацкага дзяржаўнага Сабору, які адбыўся ў Загрэбе зараз-жа пасьля распаду Аўстра Вэнгрыі. Далей Нацыянальная Рэпрэзантацыя, абвяшчае ад імені харвацкага народу сэрбскае панаваньне ў Харвацыі за бясправуна-прысвоенае, лічыць за няістнуючыя і неабавязковыя для харватаў на нацыянальным абшары Харвацііі ўсе уставы і загады, выданыя праз Белградзкі Урад. Падыймаючы барацьбу з белградзкімі узурпатарамі, Харвацкая Нацыянальная Рэпрэзантацыя зварачываецца да братніх народаў: сэрбаў і славенцаў аб дапамозе ў справе вызваленьня Харвацыі з пад-прымусова-накінутай улады, бо народ Харвацкі хоча жыць, як народ вольны і самадзельны ў, гварантаванай праз адносную умову, еднасьці з народам сэрбскім і славенскім.

Латвія. Адбыўся зьезд латвійскай соц.-дэм. партыі, на якім галоўным пытаньнем было ўдзел партыі ў Урадзе. Цантр. Камітэт запрапанаваў рэзалюцыю, ў якой выказываўся за далейшым удзелам у Урадзе, матывуючы гэта забясьпячэньнем сацыяльных здабыткаў работнікаў, умацаваньнем дэмакратычнага ладу, міру і інш.

Некаторыя з сябраў зьезду прапанавалі выхад з урадовай каоліцыі, дзеля таго, што гэта можа зьменшыць уплывы партыі ў работніцкіх кругах. Прынята рэзалюцыя Ц. К. На зьездзе выявіліся, што ў сучасны момант істнуе моцная цяга Латвіі да Расеі, партыя лічыць патрэбным зьбліжэньне з Расеяй, бачучы ў апошняй адзіны магчымы рынак для латвійскай прамысловасьці і навязаньне бліжэйшых стасункаў з ёю, як заключэньне гандлёвай умовы,—прывядзе да адраженьня латвійскай прамысловасьці, а тым самым і да адраджэньня социялістычнага руху, які ў значнай меры аслабеў, як гэта выявілася з дакладу Ц. К. галоўным чынам у зьвязку з правядзеньнем зямельнай рэформы.

Латвійскія с.-д. надта напрыхільна адносяцца да ўтварэньня ваеннага саюзу Балтыйскіх дзяржаў з Польшчай, маючы на ўвазе, што Польшча можа актыўна выступіць і тым самым уцягнуць і Латвію ў вялікую вайну з Расеяй. Некаторыя нават баяцца, што Польшча мае захватныя замеры, адносна самой Латвіі, як напр. акупацыя Дзьвінску. Зьезд закончыўся пеяньнем інтэрнацыяналу.

Сацыялістычны кангрэс.

У Брэгэнцы 4—6 красавіка адбылася конфэрэнцыя т. зв. Камітэту Дзесяці — прадстаўнікоў социялістычных інтэрнацыяналаў Амстэрдамскага (драгога) і Венскага (два з палвваю) Абгаварызаліся справы, зьвязаныя з Міжнародным Кангрэсам, які мае адбыцца 21-га траўня ў Гамбургу. У Гамбургскім Кангрэсе прыймуць удзел сацыялістычныя партыі ўсіх краёў. Камуністычныя партыя ўдзелу ў Гамбургскім Кангрэсе браць ня будуць. Шмат актуальных пытаньняў, як напр. пытаньне аб удзеле сацыялістаў у буржуазных урадах зусім ня будзе разглядацца на Кангрэсе, каб ня выкліцаць расколу сярод інтэрнацыяналу з прычыны разьбежнасьці паглядаў сярод розных кірункаў социялістычных партый.

Камуністы аб нацыянальным пытаньні.

Маскоўская губерская канфэрэнцыя камуністычнай партыі далучаецца да тэзісаў Ц. К. па нацыянальнаму пытаньню, якія састаўлены ў сэнсе, забясьпечываючым нацыянальныя дамаганьні і правы працоўных мас бышых прыгнечаных нацый, разам з абедненьнем усіх працуючых у моцны дзяржаўны, гаспадарчы і ваенны хаўрус.

За што арыштаваны пасол Луцкевич.

„Dziennik Wileński“ паведамляе, што арышт пасла М. Луцкевіча, выкліканы яго прамовай у Луцку на другі дзень праваслаўнага Вялікадня, ў якой правёў паралель паміж прыгаварам бальшавіцкага суда ў Сав. Расеі над арцыб. Цепликамі і пралатам Буткевічам і адносі намі польскай улады да праваслаўных япіскапаў у Польшчы. Гэтую прамову слухалі жаўнеры украінцы тутэйшага гарнізону, якія вышаўшы на вуліцу распачалі дэманстрацыю.

З ГАЗЭТ.

Аб асадніцтве.

Адзінай польскай газэтай, якая аб'ектыўна разглядае справы т. зв. нацыянальных меншасьцяў зьяўляецца „Walka Robotnicza“, якая ў № 12 зьмяшчае артыкул у справе асадніцтва на „крэсах“.

„Калі летам 1920 г. чырвоная небясьпека заглянула ў вочы перапужанай польскай буржуазіі, калі трэба было чым-небудзь прывадзіць сялянскіх сыноў, якія зусім ня мелі ахвоты бараніць абшарнікаў, на гвалт ухвалілі уставу аб так званым асадніцтве.

На моцы гэтай уставы „заслужаныя“ жаўнеры мелі, пасьля аканчаньня вайны, атрымаць зямлю і дзяржаўную дапамогу на загаспадараваньне.

Калі пачалі ўставу правадзіць у жыцьцё, асадніцтва адразу скіравалі на крэсы, не гледзячы на тое, што ані беларуска-літоўскія землі ані Усходняя Галіччына фармальна яшчэ не належалі да Польшчы. Бо Беларусь далучана да Польскай Рэспублікі толькі на падставе рыскага трактату (сакавік 1921 г.), а Усходняя Галіччына — толькі ў прошлым месяцы.

Гэта *крэсовае* асадніцтва мела падвойную мэту: 1) удаленьне з этнаграфічнай Польшчы часткі сельскай люднасьці і гэтым забясьпечыць абшарнікаў перад націскам сялян, дамагаючыхся зямлі, 2) паланізацыю крэсаў коштам інтарэсаў беларускага і украінскага сялянства“.

Далей газэта слушна адзначае, што першая мэта была часткаю зьдзейсьнена, бо асадзіўшы на крэсах каля 25,000 сем'яў, інакш кажучы, каля чэцьверці мільёна сялян, тым самым аслабілі націск безьзямельных і малазямельных на абшарніцкія землі Праўда. ўсё гэта каштавала сотні мільярдаў, цяжар якіх падае на ўсіх грамадзян Польшчы, але ня прынясло асаднікам вялікікіх карысьцяў, інтарэсы якіх прынесены ў ахвяру інтарэсаў абшарніка, бо нават эндэцкая прэса апісывае марныя вынікі асадніцтва, якое наагул жыве дрэнна, ня маючы сілы абрабіць сваіх дзялянак і аддаючы іх на часьць мяйсцовым жыхарам.

Другая мэта — паланізацыя — зусім не дасягнута, бо

„аблітыя навокала морам украінскай ці беларускай людпасьці, якая ненавідзіць прыбышоў, адбіраючых у яе зямлю, — асаднікі паміма ўсяго асымілююцца.

Не гледзячы на ўсё гэта сойм галасамі ўсіх польскіх партый прызнаў яшчэ 50 мільярдаў мк. п. на „запамогу асаднікам“, бо эндэкі бачаць у гэтым магчымасьць і надалей абараніць свае двары ад законных дамаганьняў безвямельных і малазямельных польскіх сялян, „Witosiki“ хочуць выкарыстаць гэтыя крэдыты для асадніцтва сваіх *багатых* мужычкоў, якія маюць

„па меншай меры аднаго каня, воз, барану, плуг, зерня на засеў, а таксама срэдствы на пражыцьцё да ураджаю 1923 г.“ Усе-ж безьзямельныя і малазямельныя, ня маючыя прыладаў і запасу грошай альбо зерня наперад выключаны.

Далей газэта пераходзіць да ацэнкі становішча тых польскіх партый, якія у часе выбараў так голасна крычалі на нашых „Крэсах“, што зьяўляюцца запраўднымі абаронцамі мяйсцовай працоўнай людпасьці.

„Аблуднае і ганьбячае становішча занялі *вызваленцы і пэпэсоўцы, якія таксама галасавалі за новым актам калянізацыйнай палітыкі.*

Клюб „Wyzwolenia“ ў якім верхаводзяць рожныя гарадзкія адвакаты і кар'ерысты, паступіў так на перакор лёзунгам, абвешчаным у часе выбарнай кампаніі; бо — каб злавіць галасы—„Wyzwolenie“ падкрэсьліла права мяйсцовай людпасьці да земляў, на якіх яна сядзіць ад веку. Цяпер-жа пасол Панятоўскі, палемізуючы з беларускім паслом Тарашкевічам, кажа, што Польшча ня можа згодзіцца з поглядам на крэсовыя землі, як на выключную ўласнасьць тубыльчай людпасьці *Гэтым самым стануў у выразнай супярэчнасьці з нядаунымі пастановамі віленскага акружнага зьезду уласнай партыі*, бо гэты зьезд абвесьціў, што „дамагаецца ўстрыманьня вайсковага асадніцтва ў сучаснай форме, калі жаўнеры здалёк.. атрымліваюць зямлю, якая здаўна належыцца мяйсцовым людзям“.

Ад імя P. P. S. пан Квапінскі выкруціўся ў такі спосаб, што сказаў: „уставу аб асадніцтве ня трэба разглядаць выключна пад кутам гледжаньня *крэсовага* асадніцтва, бо ў уставе выразна сказана, што крэдыт расьцягіваецца на асадніцтва ў *цэлай* дзяржаве“. Прыкідаючыся дурнем, п. Квапінскі а з ім і ўвесь пэпэсаўскі клюб галасавалі за прапазыцыяй, якую беларускія і украінскія паслы прызналі за зьдзек над беларускімі і украінскімі сялянамі, за нацыянальны гвалт.

Ня гледзячы на самыя жыцьцёвыя патрэбы беларускіх і украінскіх сялян паслы з „Wyzwolenia“ і P. P. S. брыдуць далей у балота калянізатарскай — нацыяналістычнай палітыкі, кідаючы ў яго мільярды, выціснутыя з працоўных мас цэлай Польшчы“.

І за гэта маюць шчырую падзяку ад эндэцка-абшарніцкай „Gazety Warszawskiej“, якая ў нумары ад 24 сакавіка пісала:

„учарашнія выступленьня п.п. Тарашкевічаў і Васыльчукоў спаткаліся з спрацівам нават з боку прадстаўнікаў „Wyzwolenia“ і P. P. S.“

Новая Аўстрыя.

„Przegląd Wileński“ ў № 7, застанаўліваецца над штучным падзелам Сярэдняй Эўропы пасьля Вэрсальскага міру, які заместа аднэй Аўстрыі стварыў некалькі меншых. Аднэй з такіх Аўстрый ёсьць цяперашняя Польшча.

„Нават сьмешна, як Польшча цяпер гневаецца, калі людзі абладаючыя чуцьцём запраўднасьці, паказываюць ёй, што найвыразьней з уласнай волі ёсьць яна in via Austriae. Хто хоча, каб польскі жаўнер стаяў з карабінам на цяперашняй польскай граніцы, той ня можа ўжо задаваць пытаньня: ці Польшча станецца Аўстрыяй, ці не? Сіхаю рєчаў Польшча сталася ўжо Аўстрыяй і нічым іншым нават быць ня можа!“

Газэта лічыць, што такое становішча ня можа быць трывалым, такое становішча ёсьць пераходнае, і прыклад Аўстрыі павінен быць грознаю перасьцярогаю для ўсіх тых, хто хацеўбы ісьці яе шляхам.

Весткі з Сойму.

Украінскі пасольскі клюб падаў да Сойму сьпешную прапазыцыю ў справе арышту ў Луцку пасла М. Луцкевіча, які аб'явіў галадоўку. Прадстаўнік Міністэрства Справядлівасьці заявіў, што пас. Луцкевіч ўжо звольнены з вастрогу, а пракурор, які зрабіў загад аб арышце будзе алдадзены пад суд.

На апошнім паседжаньні Сойму дайшло да бойкі паміж пасламі з прычыны таго, што сойм адкінуў сьпешнасьць прапазыцыі жыдоўскіх паслаў у справе эксцэсаў над жыдоўскай людпасьцю 5-га красавіка ў Варшаве. Жыдаўскія паслы ў знак пратэсту пакінулі залю паседжаньня.

Міністэрства фінансаў падало да Сойму, праэкт уставы аб дазволе ўраду далейшай пазычкі ў Р. К. К. Р. у суме 3150 мільярдаў марак польскіх, а так сама праэкт уставы даручаючай Р. К. К. Р. да далейшай эмісіі банкнотаў да агульнай сумы 2500 мільярдаў м. п.

Беларускі пасол Каліноўскі на паседжаньні адміністрацыйнай камісіі дакладываў прапазыцыю беларускага і украінскага пасольскіх клюбаў у справе рэлігійнага уціску з боку мяйсцовай адміністрацыі, дакананага на сьвяшч. і парафіянах церкві ў Дубінэ, Бельскага пав. Прынята рэзалюцыя, прызываючая ўрад неадкладна адчыніць цэркаў у Дубіне.

Сьпешная прапазыцыя

пасла Рак-Міхайлоўскага і тав. з Беларускага Клюбу у справе аткрыцьця беларускай вучыцельскай сэмінарыі у Маладэчыне.

Да вайны 1914 г. на абшарах цяперашніх ваеводстваў Віленскага і Навагрудзкага істнавала 3 вучыцельскія сэмінарыі—ў Маладэчыне, Несьвіжы і Сьвіслачы, з якіх выходзілі вучыцялі пачатковых школ на гэтых-жа абшарах. У гэтых сэмінарыях вучыліся пераважна дзеці незаможных бацькоў. І хоць навука там выкладалася тэндэнцыйна ў урадовай расейскай мове, як гэта было ва ўсей тагачаснай царскай Расеі, але ў апошніх гадох іх істнаваньня, з гэтых сэмінарый выхадзіла значная частка моладзі, сьвядомая сваіх нацыянальных абавязкаў служэньня свайму беларускаму народу ў яго роднай мове, дзеля таго што ў гэтых сэмінарыях вучыўся выключна мяйсцовы элемэнт — дзеці тутэйшай беларускай людпасьці. З акончыўшых гэтыя сэмінарыі а асабліва Маладэчынскую, і цяпер складаецца частка лепшага беларускага вучыцельства, якое апрача таго ў часе ад 1919—1921 г. скончыла дадатковыя беларускія курсы ў Вільні.

Цяпер-жа на гэтых абшарах істнуе некалькі польскіх вучыцельскіх сэмінарый для хлапцоў і для дзяўчат. У гэтыя сэмінарыі беларуская моладзь ня йдзе, дзеля таго, што яна хоча вучыцца ў сваей роднай мове, а таксама і дзеля таго, што беларуская людпасьць ня мае магчымасьці вучыць сваіх дзяцей з прычыны беднасьці.

Бяручы пад увагу арт. 109, 110 і 111 Канстытуцыі 17 сакавіка 1921 г., на падставе якіх беларускай людпасьці прыслугоўвае права адкрыцьця пачатковых школ у роднай мове з бясплатным навучаньнем, патрэбна зараз-жа адчыніць хоць-бы адну беларускую вучыцельскую сэмінарыю, ў якой-бы беларуская моладзь магла кваліфікавацца на вучыцялёў беларускіх пачатковых школ.

Такая Сэмінарыя можа быць адчынена ў Маладэчыне Вялейскага пав., дзе за часаў расейскіх істнавала такая сэмінарыя і пасьля якога і па сёньняшні дзень застаўся школьны будынак з агародам і ворнай зямлёй, якая можа служыць для практычных занаткаў па агародніцтву і прыродазнаўству.

Адкрыцьцё беларускай вучыцельскай сэмінарыі ёсьць справай актуальнай па гэткім прычынам:

1) пры пашырэньні школьнай сеці, згодна з дамаганьнямі беларусаў, якіх налічываецца на т. зв. „Kresach Wschodnich“ больш за 2 мільёны, лік выкваліфікаваных вучыцялёў у сучасны момант ня зьяўляецца выстарчаючай для заспакаеньня навуковых патрэбаў і часта здараецца, што ў беларускія школы назначаецца элемэнт чужы і да навучаньня не падгатаваны;

2) што польскія вайсковыя аддзелы, якія займалі сэмінарскі будынак, цяпер яго звальняюць і разьмяшчаюцца ў казармах.

Прыймаючы пад увагу вышэйшае, а таксама і тое, што ў прэлімінарным бюджэце на час ад 1 студня па 31 сакавіка 1923 г. ў крэдытах у суме 21.555 316.996 марак, празначаных для Міністэрства Рэлігій і Народнае Прасьветы не азначана сума на патрэбы беларускай школы, надпісаныя прапануюць:

Высокі Сойм захоча ухваліць:

Прызываецца Урад, а асабліва Мі-

ністэрства спраў Рэлігійных і Народнае Прасьветы выдаць адпаведны загад з мэтай адчыніць у Маладэчыне вучыцельскую сэмінарыю з выкладовай мовай беларускай і прыняцца ўтрыманьня яе на кошт Дзяржавы.

Сучасная усе узрастаючая дарагавізна ствapae немагчымыя варункі для выданьня газэты. Ад грашовага падтрыманьня праз беларускае грамадзянства залежыць рэгулярны выхад нашай часопісі.

Складайце ахвяры на родную газэту!

Падпісывайцеся і заахвочывайце іншых да падпіскі!

Рэгулярна ўнасіце падпіску і даплату!

СУЛІМА.

Беларускі клюб у Польскім Сойме.

I

Закончыўся першы „okres“ Сойму і дзейнасьці ў ім нашага Беларускага Клюбу.

Прадстаіць прадоўжаньне ў ім працы нашых паслоў. Прадстаяць, як можна думаць, і такія важныя перамены ў палітычным жыцьці Польшчы, як адстаўка кабінэту ген. Сікорскага і пераход улады да правай паловы Сойму..

Усё гэта натуральна выклікае патрэбу разабрацца ў тых абставінах, у якіх прышлося працаваць нашым паслам, падрахаваць, што яны змаглі зрабіць за гэты час, ацаніць прынятую імі тактыку, прадбачыць магчымыя пэрспэктывы ў будучыне.

Прадстаўнікі беларускага народу, йдучы на выбары і затым арганізуючыся да далейшай барацьбы ў Парлямэнце Польскай Рэспублікі, тым самым ужо дапушчалі надта вяжны і адказны кампраміс паміж нацыянальна-дзяржаўным ідэялам Незалежнай Беларусі і тэй рэальнай сучаснасьцю, якая была створана Рыскім Трактатам. Бяз гэтага кампраміса была-б немагчыма ніякая адкрытая палітычная праца ў краі; гэтым-жа кампрамісам азначылась і ўся дзейнасьць Беларускага Клюбу ў Сойме.

Трагічная супярэчнасьць, якая ляжыць ў аснове гэтага кампрамісу, састаіць у тым, што беларускія паслы йшлі ў Сойм насамперш дзеля таго, каб знайсьці ў ім сусьветнага рэзананса трыбуну, каб заявіць пратэст беларускага народу проціў Рыжскага Трактату, разрэзаўшага папалам жывое цела Беларусі. Адначасна-ж—самы ўдзел у выбарах у Польскі парлямэнт беларускага народу ўжо адным гэтым фактам у значнай меры даваў санкцыю гэтаму забойчаму для Беларусі трактату...

Такое палажэньне адразу раздвоівала аснаўную лінію тактыкі Клюбу, рабіла немагчымым адзінства і паступовага разьвіцьця гэтай тактыкі. Гэтая супярэчнасьць аднолькава абязцэнівала, як тактыку ідэйных пратэстаў і дэманстрацый, таксама і лінію практычнай парлямэнцкай працы.

Засталася зусім неўязьвімай толькі пазыцыя чыстага прадстаўніцтва—абароны беларускага народу ад зьдзекаў і крыўд,—без усялякага ўваходу ў якія-б там ні было палітычныя камбінацыі. Але на гэтай пазыцыі ўтрымацца было трудна і Клюб на гэтай пазыцыі ня ўтрымаўся.

Практыка антыдзяржаўных дэманстрацый хутка зрабіла-б становішча, а затым і прабываньне ў Сойме беларускіх прадстаўнікоў,—немагчымым, пазбавіўшы беларускі народ усіх тых плюсаў, якімі на практыцы мог быць апраўданы кампраміс.

Тактыка ўдзелу ў парлямэнцкіх камбінацыях уцягнула-б іх у пануючы за кулісамі гандаль, у якім нашых прадстаўнікаў ня толькі аблічылі-б, але і ашукалі-б самым безцарамонным спосабам.

Зусім зразумела, што мешаніна двух тактык павінна была даць шмат болей мінусаў, чым плюсаў: і выклікаць раздражненьне і даць у рэзультаце штось-ці падобнае да нуля ў чыстым барышы ад парлямэнцкага гандлю.

Так яно й вышла...

Становішча беларускага прадстаўніцтва заплютывалася тым, што польскае грамадзянства, ўсе партыі, бадай без выключэньняў, ня толькі не ацанілі гэтага кампрамісу, гэтай ахвяры беларускай інтэлігэнцыі, якой зьяўляўся ўдзел у выбарах, як раз наадварот — зрабіла, ў поўнай згодзе з уладай, якая распалагала магутным фізычным апаратам і вялікімі грашавымі срэдствамі,—к таму, каб не дапусьціць зусім прадстаўнікаў беларускага народу ў Сойм.

Польскаму грамадзянству патрэбны быў толькі фіктыўны ўдзел беларусаў у выбарах,—так патрэбная для дыплёматычнай працы польскіх палітыкаў па прызнаньню ўсходніх граніц Польшчы санкцыя беларускага народу.

Мы бачым, як труднае было становішча беларускіх паслоў у Польскім Сойме.

Беларускі Клюб, арганізуючыся і састаўляючы свой Статут, назваў сябе „безадказнай апазыцыяй“.

Гэты тэрмін, палемічна створаны праціўнікам, наагул кажучы, ня зусім ясны.

Але адносна да Беларускага Клюбу трэба было думаць, што ён азначае прызнаньне і прыняцьце, як базу практычнай плятформы, польскай гаспадарсьцьвеннасьці—бо іначай праўна ня можна было быць выбраным у Сойм,—але адначасна з *тым і поўнага* і паступовага непрызнаньня *непрыняцьця* ўсяго курсу Ўрадовай палітыкі, непрыняцьце на сябе аргіогі якой бы *там ні* было адказнасьці за любы *кабінэт* у даных варунках, а тым болей удзел у якой-небудзь урадовай камбінацыі.

Ці *выдзержаў* Беларускі Клюб гэтую *агульную лінію* намечаную ім у Статуце *аснаўной тактыкі?*

Трэба сказаць, што не.

Калі з *пункту* гледжаньня „безадказнай апазыцыі“ *пры* юрыдычнай неабходнасьці стаць на грунт польскай дзяржаўнасьці і можна яшчэ з нацяжкай дапусьціць *і* апраўднасьць галасаваньне *Беларускага* Клюбу за Прэзыдэнта *Рэспублікі,* дык ужо абсалютна нічым *няможна лёгічна* апраўдаць галасаваньне за ўрад наагул, а за ўрад ген. Сікорскага асабліва.

Ніякімі агаворкамі аб тым, што Клюб не бярэ на сябе адказнасьці за гэты Кабінэт, ня можна выйсьці з фатальнай *супярэчнасьці:* ўсе гэтыя агаворкі засталіся пустымі словамі, калі апіраючыся на такое, хай не паўнацэннае, парлямэнтарнае падтрыманьне, кабінэт Сікорскага як ні-як атрымаў *даверые* Сойму, а з ім і поўную юрыдычную апору свае фактычнае ўлады.

Калі бяручы ўдзел у выбарах Прэзыдэнта, нават галасуючы за яго, Беларускі Клюб выказаў і дэманстраваў сваю лёяльнасьць, дык галасуючы за ўрад ён выразіў такое недаруемае нелёгічнае пуставерые, за якое абавязкова павінна была прыйсьці самая жорсткая расплата.

Так яно й вышла ў запраўднасьці.

(Далей будзе).

ДОРОШЭНКО.

Барацьба Ірляндыі за сваю волю.

(гл. № 5 „Н. Ж.“).

Мэтаю Англіі было на векі заўладаць багатым краем, абы вольна карыстаць яго дзарабытам і эксплатаваць насяленьне. Але дзеля гэтага трэба было-б зусім зьнішчыць нацыянальную сьвядомасьць народу і перарабіць яго ў пакорную масу нявольнікаў. Каб правесьці свой плян у жыцьцё, Англія ня спынілася перад самымі рашучымі захадамі. Ангельскі ўрад не заяумаўся выдаць цэлую сэрыю шорсткіх законаў проці каталікоў-ірляндцаў, як напрыклад: каталікі ня мелі права выбіраць да парламэнту сваіх паслоў, ня мелі права займаць урадовыя пасады, купляць зямлю, ці набываць якую іншую ўласнасьць,—не маглі вольна перадаваць у спадчыну сваю маемасьць і інш.

Таксама былі забаронены шлюбы паміж каталікамі і пратэстантамі. Работнікі каталікі мусілі працаваць у свае сьвяты, бо іначай іх чакалі цяжкія кары і наадварот яны мусілі сьвяткаваць пратэстанскія што значыць ангельскія сьвяты, хадзіць у гэтыя дні да ангельскай царквы. Нарэшці скасаваны былі ўсе родныя школы, а ірляндзкія дзеці павінны былі хадзіць да ангельскіх (пратэстанскіх) школаў, дзе ім забаранялі гаварыць па свояму ня толькі ў школе, а і за яе сьценамі.

У ангельскай дзяржаве толькі адны ірляндцы прытрымліваліся каталіцкае веры, дзеля чаго ўсе ўціскі проці каталіцтва трэба ўважаць та ўціск проці ірлянскага народу. Ірляндцам прыходзілася выбіраць адно з двох альбо зрабіцца рэнегатамі (адступнікамі, перакіньчыкамі) і тым здабыць усе грамадзянскія і палітычныя правы альбо быць вернымі сынамі свайго народу - стаць бяспраўнымі нявольнікамі. Паняцьця рэлігіі і нацыянальнасьці цесна адно з другім вязалася і былі раўназначнымі: ірляндчык, гэта каталік, пратэстант, значыць ангелец.

Такім чынам для ірляндцаў весьці барацьбу за веру значыла абараняць сваю нацыянальнасьць. Дзеля гэтага няма дзіва, што першыя выступленьні ірляндцаў праводзіліся пад штандарам веры.

Абы вырваць з карэньнем ненавісны каталіцызм ангелскі урад забараніў жыць у Ірляндіі каталіцкім ксяндзам і біскупам. У той самы час па ўсей ірляндіі былі закладзены пратэстанскія парахвіі (хаця пратэстантаў было ўсяго 1, 5%/" насяленьня) і пратэстанскіх духаўнікоў прымушана было ўтрымываць каталіцкае насяленьне, плацячы на гэта дзясятую частку свайго даходу.

Такім чынам ірляндцы за тое, што моцна трымаліся бацькаўскае веры, былі пазбаўлены бадай усіх грамадзянскіх правоў і мажлівасьці выбіраць сабе пажаданую працу. Адна толькі праца аставалася ірляндцам — гэта хлебаробства ды і то не на сваёй зямлі, а нанятай за высокі чынш у памешчыкаў чужынцаў, якія зваліся лэнд-лордамі. Тыя-ж паны аддаючы зямлю ў арэнду, не будавалі хатаў, не абгарожывалі іх, наагул не заводзілі ніякага гаспадарства—ўсё гэта павінны былі рабіць самі чыншавікі на свой кошт. Вядома, што пры такіх варунках чыншавікам (албо як іх звалі, фэрмерамі) жылося ня лёгка: яны ледзьве маглі пракарміць сваю сямью. Але і такое мізэрнае існаваньне ня было трывалым: лэнд лорд кожную хвіліну мог адабраць зямлю ў фэрмера і перадаць таму, хто балей заплаціць

Ня гледзячы на цяжкія варункі працы каля зямлі, ірляндцы ня маглі выбраць сабе другога заняцьця. Праўда, прыродныя багацьці, блізкасьць мора ды добрыя прыстані, здавалася-б павінны былі спрыяць росквіту прамысловасьці і гандлю. І сапраўды: гэтыя занацьця пачалі было шырыцца ў Ірляндыі, але гэта было не на руку ангельскім купцам, якія баяліся канкурэнцыі з боку ірляндзкіх купцоў і вот урад выдаў закон, якім стрымываўся росквіт гандлю і прмысловасьці Ірляндыі.

Да ўсякаго гэтага па ўсей ірляндскай тэрыторыі было расквтэрована на пастой ангельскае войска, каб унемажлівіць усякую спробу атпору.

Вынікамі такое палітыкі ангельскага ўраду, насяленьне Ірляндыі абяднела. Пачаўся голад. За адзін толькі напр. 1747 год памерла ад голаду каля поўмільёна народу. Адзін чужаземец, які ў першай палове 18 веку праеждажаў па Ірляндыі, так апісывае сваю падарожу:

„Наш шлях ляжаў праз землі, што былі засеяны. быццам поле бою, трупамі, і трупы гэтыя валяліся не прыбранымі ў равах каля дарогі, ў кучах усялякага сьмецьця. Сабакі і драпежныя птушкі пажыралі трупы людзей, памёршых з голаду.“

Той жа падарожны далей кажа так: „страва звычайнага хлебароба, нават калі ня было голаду была такая паганая, што нават наша дамовая жывёла ня ела б яе. Людзі карміліся тут бульбаю і сывараткаю. Калі ўраджайнасць на бульбу была кепская, мерлі з голаду. Часта гэты абяздоляныя карміліся самымі дзікімі карэньямі, што расьлі на балоці і ў полі. Мяса здохлага каня яны елі з вялікаю радасьцяй, нават калі яно пачынала ўжо загніваць.“

Страшэннае было становішча нявшчаснага Ірляндскга народу ў канцы 18 веку. Аслабнуўшая ад голаду, здушаная жалезнай рукой брытанца, прыгнечаная старонка, здавалася, мусіла памерці. Але нявыгартаемая сіла жывучасьці народнага руху!

Зьдзек, зьдзірствы і гвалт ангельскага ўраду і паноў, голад і хваробы дашчэнты вычарпалі цярпеньня паднявольнага народу.

Сярод сялянства пачалі паўставаць патаемныя таварыствы: адны з мэтаю абароны роднае веры. другія ставілі сваею задачаю зьніштажэньне ангельцаў і помста за іх зьдзекі.

Вядома, што гэтыя неаб'еднаныя таварыствы не маглі скінуць панаваньня ангельцаў ,але не давалі ім пакою і стрымывалі іхнюю бязсорамную сваволю.

Ад імяні польскага народу.

У апошнія часы, што раз часьцей у нас і заграніцаю разьлягаюцца напады і абвінавачаньні на польскі народ за той безлад і крыўды, якую церпяць т. наз. меншасьці пры сучасным урадзе.

А дзеля таго мушу зазначыць, што польскі народ і польскі урад далёка ня тое самое.

Рабочыя, сяляне і пралетарская інтэлігенцыя Польшчы таксама не вінавата ў уціску беларусаў, ўкраінцаў і жыдоў як не вінаваты ў акупацыі Руры рабочыя, сяляне і інтэлігенцыя Францыі.

У гэтым віновата польскае шляхоцтва,—польскія паны, якія стаяць пры ўрадзе.

Рабочыя Польшчы таксама змагаюцца з панамі з іх імпэрыялізмам і прыгнячэньнем іншых нацыянальнасьцей.

Польскі сялянін таксама малазямельны, плаціць вялізарныя налогі і знаходзіцца пад панскай уладай.

Польскія рабочыя бадай зусім агранічаны ў палітычных правох і заработкі іх мізэрныя. Шмат палітычных змагароў, за барацьбу аб палепшэньні быту працоўных, таксама седзяць у вастрогах.

Польскія рабочыя і сяляне зусім не жадаюць ніякіх захватаў чужых зямель, ніякага прыгнячэньня іншаземцаў. Як рабочыя і сяляне іншых краёў, польскія рабочыя і сяляне хочуць жыць у згодзе у з усімі народамі. Ня іх віна, што капіталісты робяць наадварот.

Вось дзеля чаго нельга вінаваціць увесь польскі народ за дзейнасьць яго ўраду.

З. К—скі.

Сявец цемры.

Куратор Пінскага Школьнага Вокругу К, Шольбэр у сваей паперы ад 15-IX—1922, № 5906 загадывае Нясвіжскай беларуска-расейскай гімназіі прыймаць моладзь *толькі* праваслаўнай рэлігіі. У гэтай жа паперы Куратар забараняе прыймаць вучняў-жыдоў у гімназію.

Куды пасьля гэтага дзявацца беларусам-католікам і чаму жыдом нават з праслыўшым у Польшчы, „numerus clausus“ нельга карыстацца сьветам навукі.

А дзеля таго,—што К. Шольбэр ёсьць чыноўнік сучаснага ураду, які шмат абяцуе „дакучлівым меншасьцям“ а даець... ды хто з нас не знае цану гэтых обецанак?!

Цяперашнему куратору важна не асьвета, а палітыка ды яшчэ нясумленная—трэба каб гімназія, якая утрымліваецца з мізэрных вучнёўскіх плат — была зачынена; тады куратор будзе ў заслузе, а дзеці пойдуць у польскія гімназіі, дзе фабрыкуюцца шовіністы і абаронцы шляхоцтва.

У дзяржаве, дзе шануецца закон і наказуюцца парушыцелі, яго такі сявец цемры атрымаў-бы самую строгую кару.

З усяе Беларусі.

„Касук urzęduje“.

Раённы III району пан Шварц, які жывець у мястэчку Даўгінава, Вялейскга п., загадаў усім крамнікам, якія мелі вывяскі пабеларуску, пазьнімаць іх, бо тут па яго недаросшаму розуму няма ніякіх беларусаў а ёсьць „rdzenna Polska“.

З гэтай прычыны гэтаму самаму пану Шварцу шмат каму з крамнікаў прышлося падаваць заявы ў справе гэтых вывесак, але пан Шварц хоча прадстаўіцца „добрым“ і адукованым урадоўцам і ўсе заявы бракаваў па 3-4 разы, бо былі напісаны неграматычна папольску, альбо брыдкім почаркам.

З усяго быў бы вясёлы сьмех, што ў „rdzennej“ Польшчы цэлае мястэчка ня зможэ напісаць папольску, каб толькі не прышлося кожную заяву аплачываць

маркамі ды марнаваць час на каліграфію, якая аздобілаб архіў хана районнага.

Чаго толькі ў нас ня бывае!

Мястачковы.

Слуцак. Слуцкі пав.

Мінулаю восеньню Слуцкі Пав. Аддз. Нар. Асьветы адчыніў у Слуцку Сельска-гаспадарчы тэхнікум. Быў апрацован належачы вучэбны плян, набраны належачы склад настаўнікаў і вучняў. Пры тэхнікуме была адчынена сямёхгадоўка з сельска-гаспадарчым нахілам. Часова тэхнікум зьмяшчаўся ў другой сямёхгадоўцы. Праца ішла вельмі добра. Нядаўна прыехаў вызваны з Петраграду вучоны агранам і вучоны садавод. Вучэбны плян павялічыўся спэцыяльнымі дысцыплінамі. Беларусазнаўству адведзена належачае мейсца. Клапоцячыся аб тэхнікуме, Слуцкі Пав. Аддзел. Нар. Асьветы пачаў рэмонт манастырскага, корпусу які быў вельмі абадраны вайсковымі часьцямі. Ужо хутка можна б дзе значнай частцы тэхнікуму пакінуць чужы будынак, дзе ён працуе ў другую зьмену.

Вялікай затратай сіл і сродкаў Аддзел адчыніў і паставіў на ногі такую патрэбную ўстанову для сельска-гаспадарчай Случчны, як гэты тэхнікум.

Пратэст супроць пагвалчэньня нашых правоу.

Мы жыхары вёскі Пагост, Даўгінаўскай гміны, вялейскага павету горача пратэстуем супроць удушэньня нашай культурнай працы праз закрыцьце газэты „Наша Будучына“, якая прасьветляла нас і адкрывала вочы нашаму несьвядомаму сярмяжнаму народу. Але ня сумуйце, браты, мы народ духам моцны і заўсёды гатовы адзін другому памагчы і якія бы ня былі перашкоды мы верым што іх зможам і даб'емся вызваленьня нашаму народу.

(5 подпісаў).

З беларускага жыцьця.

— У залі Віл. Белар. Драматычнай майстроўні пад рэжысэрыяй Міхалевіча 18-IV—923 г. пастаўлена была апэрэтка з украінскага „Кум млынар“ у адным акце, на карысьць Беларускага притулку.

— Вучнямі Радашкоўскай гімназіі ладзіцца вялікая вечарына. Пастаўлена будзе „Пінская шляхта“ Марцінкевіча і дывэртысмэнт.

— На Вялікдзень вучні Нясьвіжскай гімназіі ладзілі вечарыну ў вёсцы Жуковічы. Згулялі „Чорт і баба“ пьеса Аляхновіча.

— 8 красавіка з Горадзенскага вастрогу выпушчаны 23 беларускіх дзеячоў з ліку арыштаваных у апошніх часах 47 асоб, абвінавачаных у праціва-дзяржаўнай дзейнасьці.

— Міністэрства Унутраных Спраў удзяліла п. Міткевічу канцэсыю на адкрыцьцё „беларускага“ Тэлеграфнага Агенства. (A. W.)

— **Новыя кніжкі.** У г. Кенігзбэргу ў хуткім часе будуць надрукованы пабеларуску гэткія кніжкі: 1. *Малышау.* Анатомія і фізыялёгія чалавека, 180 стр. Пераклад І. Цьвікевіча (друкуецца ў ліку 3000 экз.). 2. *Душэўскі.* Прасталінейная трыганамэтрыя з задачамі, 200 стр.

— **Партрэты беларускіх пісьменьнікаў і дзеячоў.** У Беларускай кнігарні (Завальная № 7) прадаюцца, нядаўна выдадзеныя партрэты вялікага фармату беларускіх пісьменьнікаў і дзеячоў: Ф. Богушэвіча, А. Гаруна і І. Луцкевіча. У хуткім часе будуць адпрукованы партрэты Я. Купалы. Як. Коласа і Б. Тарашкевіча. На паштовых пісульках удала выдадзены партрэт Ф. Багушэвіча.

Беларускі тыднявік „Саха“.

18 красавіка ў Вільні пад рэдакцыяй М. Косьцевіча вышла новая беларуская часопісь „Саха“ якая па загаду камісара ўраду была канфіскавана.

Перадавіца № 1 так кажа аб напрамку часопісі.

„Тыднявік „Саха“ зьяўляецца органам працоўных масаў, вёсак і гарадоў Захадняе Беларусі—парабкаў, малазямельных, фабрычных і рамесьленых рабочых і ўсіх родаў служачых. Асьвятляючы бягучае жыцьцё з пункту гледжаньня інтарэсаў працоўных масаў, боручыся за эканамічнае, палітычнае і нацыянальнае вызваленьне вясковага і гарадзкога пралетарыяту і малазямельных Захадняй Беларусі просім...“

Пасьля гэтага нам зразумела прычына канфіскаты газэты.

Зьмест номера такі: Ад рэдакцыі Аб прызнаньні ўсходніх граніц. Француская пазычка для Польшчы. Магутная зброя рэакцыі. Рэзультаты дарагоўлі на вёсцы. Перад агульным дагаворам у земляробстве. Палітыка „Вызваленьня“. Сусьветная безрабоціца. Бесправўная вайна. Канфэрэнцыя ў Лёзаньне. Бягучае жыцьцё: 1. Як абходзяцца з рабочымі Польшчы ў саюзнай Францыі. 2 Абшарнікі наступаюць. 3. Як капіталістыя адбудовываюць зруйнованыя акругі. 4. „Эксплоататары усіх нацыянальнасьцяй злучайцеся!“ 5. Цяпер і тры сталецьці назад. 6. Убогі слуга Хрыста. 7 П'янства ў Польшчы. 8. Але я вярнуся. З вёсак і гарадоў. За кардонам.

— **Агульны** сход сябраў Беларускага Грамадзянскага Сабраньня ў Вільні склікаецца на 28 і 29 красавіка. Парадак дня: а. Справаздача за 22 і да 1 красавіка 23, б. Справаздача Рады Старшынь і рэвізыйнай Кам. в. зацьвярджэньне бюджэту, г. Перавыбары Рады Старшынь і Рэвіз. Кам. Першы дзень пачатак сходу а 7 г. в. а другі — а 12 г. дня.

— Прывітаньне ад Рады Беларускай Нацыянальнай Сувязі. У пятаю гадавіну абвешчаньня незалежнасьці Беларусі Рада Беларускай Нацыянальнай Сувязі засылае Вам павітаньне. Пяць гадоў мінулага змаганьня даказалі, што ў барацьбе растуць і гартуюцца нашы сілы, і аб'еднываюцца ўсе напрамкі беларускай думкі.

Дык с цьвердай воляй і верай клічам, разам з Вамі: ніхай жыве Незалежная і Непадзельная Беларусь.

ІГНАТ КАНЧЭУСКІ.

21-га красавіка памёр пасля доўгай і цяжкай хваробы супрацоўнік „Новага Жыцьця“ і каапэратар Ігнат Канчэўскі.

Першы Зьезд Вучыцялёў Беларускіх Сярэдніх Школ Заходняе Беларусі.

Скліканы Беларускай Цэнтральнай Школьнай Радай у Вільні зьезд беларускіх вучыцялёў беларускіх сярэдніх школ Захадняе Беларусі працягнуўся ад 11 да 14 красавіка.

На зьездзе з рашучым правам голасу прынялі ўдзел такія ўстановы: Цант. Школь. Рада (12 прадст.), Вілен. Белр. Гімназія (21 прадст.) Навагрудзкая гімн. (6 прадст.), Нясьвіжская гімн. (5 прадст.). Гарадокская гімн. Вялейскага пав. (4 прад), Радашкоўская гімн. (3 прадст.), Віленская Праваслаўная Духоўная сэмінарыя (2 прадст), апрача таго былі прадстаўнікі: ад Вучыцялёў Пачатковых Школ, ад Бацькаўскага К-ту пры Вілен. Гім., ад Саюзу Беларускіх студэнтаў, ад Віленскага Саюзу Каапэратываў, ад Беларускага Грамадзянскага Сабраньня, ад Духоўнай праваслаўнай Кансысторыі, ад рэдакцыі „Новае Жыцьцё“, а такжа быўшыя ў той час паслы і сэнатары

Справаздаўчыя даклады з мейсц выясьнілі цяжкае становішча беларускай сярэдняй школы ў Зах. Беларусі. Зазначаны цэлы шэраг беспадстаўных прыдзіркаў з боку адміністрацыі. Так, у Нясьвіжскай гімназіі забаронена выкладаньне геаграфіі Беларусі як асобнай навукі, забаронена прыняцьце вучняў католікаў і жыдоў Радашкоўскай гімн. вучням старшых клясаў не даецца адсрочкі для адбываньня вайсковай службы і шмат інш.

Грам. А. Луцкевіч прачытаў даклад аб арганізацыі бел. сярэд. школы. Гр. М. Красінскі — аб тыпе сярэдняй школы і яе навуковым пляне. Гр Грэцка — аб узгадаваньні і пазашкольнай працы вучняў. Гр. Гарэцкі аб пастаноўцы выкладаньня беларусазнаўства ў Правасл. Духоўн. Сэмінарыі ў Вільні. Быў прачытаны даклад аб мэтадах выкладаньня па кожнай навуцы паасобку.

Зробленыя даклады былі фармальна разгледжаны і тэзы іх апрацаваны ў спэцыяльна створаных сэкцыях: арганізацыйнай, гуманістычнай, матэматычнай і мастацкай.

Галоўныя прынятыя рэзолюцыі Зьездам:

У справе аб'еднаньня беларускіх сярэдніх школ. „Першы Зьезд Вучыцялёў Беларс. Сярэд Школ прызнае патрэбным, каб усе бел сярэд. школы перайшлі ў рукі Таварыства Беларускае Школы, я ое зьявіцца гаспадарам сказаных школаў у межы Польскае Рэспублікі.

.. Беларуская Цэнтраль. Школьная Рада павінна ўзяць на сябе заступніцтва перад школьнымі ўладамі за ўсе аб'едканыя беларускія сярэд школы. атрыманьне канцэсый, зацьверджаньня уладай дырэктараў, агульнае кіраўніцтва і кантроль над унутраньнім жыцьцём школаў з навуковага ўзгадаваўчага боку, правядзеньне поўнае беларусызацыі там, дзе яна дагэтуль незакончэна, і пляновае адкрываньне новых сярэдніх школаў, дзе яны патрэбны“.

Аб тыпе школы. „Пры сучаснай ступені разьвіцьця беларускае грамадзкае сьвядомасьці і культуры мэта беларускае школы — выховываць беларускага інтэлігэнта, шырока азнаёміўшы яго з беларускай і сусьветнай культурай і узмацаваўшы ў ім нацыянальную сьвядомасьць. З існуючых у Польшчы тыпаў гімназій найбольш адпаведнай для гэтае мэты зьяўляецца тып гуманістычнае гімназіі“.

Аб зьбеларушчаньні духоўных сэмінарыяй праваслаўнай і каталіцкай.

Аб утварэньні часопісі, якая-б асьвятляла навуковыя пытаньні, датычачыя сярэд. школы.

Аб неабходнасьці стварэньня у часе летніх вакацыяў курсаў для настаўнікаў бел сярэд. школаў

Аб пашырэньні пачатковых школаў

Аб навуковай і маральнай сувязі бслр. сярэд. школаў.

Зьезд атрымаў прывітаньні ад Белар. Гім. з Дзвінску і з Люцына, ад Беларус. Тавар. „Бацькаўшчына“ з Дзьвінску, ад Белар. Сакольскага Г—ка ў Празе (Чэхословакія). На адчыненьні Зьезду быў прысутны куратар Віленскага вокругу пан Гэнсёроўскі.

У часе ўсяго зьезду і яго працы ў сэкцыях былі прысутны прадстаўнік ад Дэлегата Ураду і ад Куратара.

Учасьнікам З'езду быў зладжаны праз Драматычную Майстроўню спэктакль, а ініцыятарамі зьезду — вячэра ў памешканьні Белар. Грамадз. Сабраньня.

Ж.

Пісьмо з Чэхіі.

Падзеі апошніх некалькі гадоў прымусілі шмат каго з беларусаў пакінуць родны край і туляцца па рожных старонках Эўропы. Пэўная іх грамадка апынулася ў Юзэфове (Чэхія) частка якіх вучыцца ў Дзяржаўнай Украінскай Гімназіі. Знаходзячыся далёка ад сваей Бацькаўшчыны, адарваныя ад усяго роднага, яны аднак засталіся яе вернымі і кахаючымі сынамі.

Надыходзячыя пятыя ўгодкі абвешчаньня Незалежнасьці Беларусі прыпалі ў дзень калі ў украінцаў зьявіўся днём жалабы і пратэсту супроць прызнаньня Усходніх межаў Польшчы. Сьвяткаваньне адложана было на 27 сакавіка. Украінцы увесь час адносіліся і адносяцца да беларусаў вельмі прыхільна і спачуваюча і ня гледзячы на невялікі працэнт беларусаў у школе, Педагогічная Рада Гімназіі, абвесьціла дзень гэты сьвяточным для ўсёй школы.

Урачыстасьць началася а 7 гадзіне раніцай набажэнствам, якое адправіў у местовым касьцеле сьвяшчэньнік айцец Крывуцькі. Па набажэнстве ўсе рушылі да школьнае залі, прыгожа убранае беларускім і украінскімі сьцяжкамі, партрэтамі і елкай, куды ў гэтым часе таксама прыбылі запрошаныя госьці: начальнік табору палк. Вольф, Педагогічная Рада ў поўным складзе на чале з Дырэктарам п. Кравцом, прадстаўнікі ад вайсковых і культурна-прасьветных арганізацыяў агулам было каля 200 асобаў. Сьвяткаваньня пачалося уступным словам У. Жылкі, у якім прамоўца прывітаўшы прысутных у кароткіх словах абрысаваў вальнасьць і значэньня гэтага сьвята для беларусаў. Затым былі прачытаны два рэфараты, першы на тэму: Гістарычнае разьвіцьцё беларускае нацыянальна-палітычнае думкі“, які прачытаў Я. Габрыновіч і другі „Беларускія пісьменьнікі як прарокі беларускага адраджэньня“ чытаў У. Жылка. Пасьля гэтага былі прадэклямаваны тры вершы „Палесьсе“, Я. Коласа, „Пагоня“ М. Багдановіча і „Гэй наперад“ Я. Купалы. З прывітальным словам ад вайсковых украінцаў выступіў пар. Вовк, які ў сваёй кароткай і гарачай прамове сказаў. што беларускія і украінскія сьцягі змагаліся і змагацца будуць поруч у барацьбе з агульным ворагам да поўнае перамогі, дзень якое недалёкі. Урачыстасьць закончылася пяяньнем Беларускага Гымну, пасьля чаго усе разышліся.

Ад сьвята засталося сьветлае ўражаньне у ваўсіх на ім прысутных Яшчэ раз выказаліся шчырыя адносіны з боку братоў нашых Украінцаў і іх спачуваньне нам беларусам у барацьбе за незалежнасьць. Шчыра яны падзялілі радасьць нашу з прычыны такога вялікага для беларусаў сьвята і разам з тым нашае гора што ідэал гэны і дасюль ня зьдзейсьніўся. Сэрцы беларусаў поўны ўдзячнасьці да братоў Украінцаў.

Асаблівая-ж падзяка пану Дырэктару Кравцю, які паклаў многа працы дапамогшы нам як сваім прадстаўніцтвам перад чэскай уладай, просячы дазволу на сьвяткаваньне так і добрай і карыснай для нас радай.

К—ц.

З Мэнску.

Беларуская Дзяржаўная і Унівэрсытэцкая Бібліатэка.

Згодна з плянам арганізацыі Беларускай Дзяржаўнай і Унівэрсытэцкай Бібліатэкі, яна павінна зьяўляцца цэнтральным краёвым кнігазборам, адначасна выпаўняючым функцыі фундамэнтальнай акадэмічнай бібліатэкі, пры галоўнай вышэхшай школе Беларусі і разам з тым дзяржаўнай бібліатэка. Гэта быў праэкт цэнтралізацыі кнігазборнай справы на Беларусі. Рэальнае ажыцьцяўленьне гэтага праэкту стала магчыма толькі дзякуючы падтрыманьню яго рэктарам Б: Д Ун—ту пр. Пічэтай і загадчыкам Акцэнтру НКА Некрашэвічам. 1 мая г. г. Бібліатэка была афіцыяльна адчынена ў новым памяшканьні, як Дзяржаўная і унівэрсытэцкая бібліатэка Беларусі. Канчатковае афармленьне Б. Д. і У. Бібліатэкі было ўчынена дэкрэтам Рады Народных Камісараў Беларусі ад 12 верасьня г. г.

Аснаўнымі кніжнымі фондамі Бібліатэкі зьявіліся неарганізованыя кнігазборы Наркамату Асьветы Беларусі сабраныя ім у часе рэвалюцыі (да 40.000 тамоў), бібліатэка б. Духоўнай Сэмінарыі (да 20.000 т.) і шэраг другіх значных папаўненьняў. Пры дапамозе Цэнтральнанага Выканаўчага Камітэту Беларусі, які уважна адносіўся да патрэб бібліатэкі, былі цалкам закуплены акад. Е. Карскага, праф. Н. Янчука, праф. П. Жуковіча, І. Карніл ава, О. Дылы і др. Найбольш значныя ахвераваньні кнігамі Бібліатэка атрымала ад Управы Замежнага Гандлю Беларусі і ад д-ра Гурвіча з Нью-Ерку (д-р Гурвіч родам з Менску). Усяго за год бібліатэка атрымала каля 100.000 тамоў, з якіх да 25 кастрычніка зарэестравана 89.000 т.

Важным фактам у сираве папаўненьня Беларускай Дзяржаўнай і Ун-івэрсытэцкай Бібліатэкі зьяўляецца Расейская Кніжная Палата, ад якой Бібліатэка дастае адзін экзэмпляр усіх выданьняў, выходзячых у межах Савецкай фэдэрацыі.

Важнай галінай працы Бібліатэкі зьяўляецца ўкладаньне беларускай картэкі — картачнага каталёгу ўсіх калі-небудзь выйшаўшых кніжак пабеларуску альбо аб Беларусі. Гэтай працай займаецца Беларускае бібліаграфічнае бюро пры Бібліатэцы.

Трэба таксама ўспамянуць аб Беларускай Кніжнай Палаце, якая істнуе пры Бібліатэцы і затрымлівае 2 экзэмпляры ўсіх выданьняў, выходзячых на тэрыторыі Беларускай Савецкай Рэспублікі

Прымаючы пад увагу тую натужную працу, якая вядзецца Бібліатэкай, і тую ўвагу, з якой адносіцца да яе Праўленьне Б. Д. Ун—ту, а таксама вышэйшыя дзяржаўныя органы Савецкай Беларусі, дае надзею, што ў блізкай будучыне Б. Д. і Ун. Бібліатэка стане вялікім кнігазборам, маючым значэньне для ўсяе Беларусі.

Л. З.

З Вільні.

Новая літоуская газэта.

У Вільні пачала выходзіць новая тыднёвая газэта „Wilniaus Kelias“ на літоўскай мове. Рэдактар—выдаўца Іонас Кукліс.

Ахвяры на „Новае Жыцьце“.

Ад X з Латвіі 500 лат.

„ Сьцепанюка Ан. 5000 н м.

„ Нічіпурэнкі—2 доляры.

Рэдактар-выдавец Я ЛАГІНОВІЧ.

Друкарня Дворжэца, Завальная 32